№ 7-8 (87-88)
Июль 2010 г.

Глуская ПАНОРАМА

АЛЬГЕРД АБУХОВИЧ

В этом году исполняется 170 лет со дня рождения Альгерда Абуховича. Он считается одним из основателей белорусской басни. Известно о нем немного. В то же время даже из тех сведений, которые дошли до наших дней, видно, насколько интересным человеком он был.

Альгерд Абухович родился 25 июля 1840 года в Калатичах, которые тогда относились к Бобруйскому павету, в семье шляхтичей Рихарда и Каролины Абухович, судей Мозырского уезда.

Родители Альгерда имели больше 3200 десятин земли.

Прабабушка Альгерда Марьяна происходила из рода графов Бондинелли, представители которого переселились в Рэч Посполитую из Италии.

Как пишет А. Абухович в своих мемуарах, появился на свет он калекой, приняли его с жалостью, думали, что умрет или будет идиотом. Через день его крестили в Глуском костеле.

Альгерд выжил и благополучно дожил до 12 лет, когда родители пожелали отдать его учиться в Слуцкую гимназию. Но чтобы над калекой не издевались в школе ровесники, родители решились на операцию. В Беларуси доктора тогда опасались еще делать такие операции, и поэтому решено было ехать в Киев к профессору Караваеву, где жили дяди Альгерда.

Ехали в карете, запряженной шестеркой лошадей. Добравшись до Киева, сходили на прием к профессору, который назначил операцию на следующий день.

Юный Альгерд мужественно перенес операцию. Ее сделали 13 апреля 1852 г., делали без наркоза, но



Альгерд Абухович
Художник Михаил Ветик

мать Альгерда, сидевшая в соседней комнате, не услышала ни одного крика.

В этом далеком путешествии запомнились Альгерду ненасытная, подозрительная власть – полиция, жандармерия и свист розог со всех сторон.

После операции Альгерд с матерью переехали в Слуцк, где он

начал учебу в Слуцкой гимназии, а отец поехал в Грабово, в Мозырский павет.

После нескольких урожайных лет доходы семьи Абуховичей увеличились втрое, и они смогли купить деревню Заполье вдобавок к остальным владениям. В результате целая тысяча «душ» работала на хлеб для молодого Ольди.

В 1855—1856 годах родители послали своего сына учиться в Женеву. А через 3-4 года Альгерд перебрался в Париж.

За несколько лет, проведенных за границей, Альгерд освоил английский, французский, немецкий, итальянский и испанский языки.

На родину Альгерд Абухович вернулся в конце 1862 или начале 1863 года в связи с восстанием под руководством Кастуся Калиновского.

По воспоминаниям современников, Альгерд рассказывал о своем участии в этом восстании.

После восстания жизнь Альгерда Абуховича коренным образом изменилась.

После отбытия наказания он вернулся в родные места. Но семья коренных шляхтичей восстала против него, когда он предложил отдать землю крестьянам. На этой почве он рассорился со всеми своими родственниками.

Тогда А. Абухович выбрал из своей библиотеки любимые книги и ушел из родного дома. Вначале он жил у своего товарища Рассудовского в окрестностях Слуцка, а позже перебрался в Слуцк. Там он зарабатывал на жизнь, давая частные уроки иностранных языков.

Около 1866 г. Альгерд Абухович женился. Но брак этот не был счастливым. Через 7 лет его жена умерла.

Альгерд Абухович умер (10) 22 августа 1898 г. Его похоронили на городском кладбище.

Подтверждений тому, что при жизни А.Абуховича его произведения были опубликованы, пока нет.

Известно, что впервые это произошло только через семнадцать лет после его смерти, когда в «Белорусском календаре» за 1915 год, изданном в Вильне в 1914 г., были помещены басни «Ваўкалак» и «Старшына».


В 1916 г. в десяти номерах газеты «Гоман», которая выходила в Вильне, были опубликованы фрагменты его мемуаров. А в августовском, 49-м номере газеты, содержавшем окончание этих мемуаров - стихотворение «Дума а Каралю XII».

Позднее в школьном учебнике «Родны край» появились его басни "Суд" и "Воўк і лісіца".

Рукописи двух басен Абуховича хранятся сегодня в Вильнюсе.

Рукописи переводов двух басен Абуховича на польский язык находятся в Польше.

И. Кирин



Бронзовый горельеф Владимира Мелехова, посвященный Альгерду Абуховичу

ВАЎКАЛАКА

Альгерд Абуховіч

Чараўніца уракла:
Быў я колісь ваўкалакам,
Бегаў чортам ўздоўж сяла;
І к гавядам поўзаў ракам,
І людскую знаў гаворку,
І з сабакамі з надворку
Гаварыць я спосаб меў.
За гумном раз ціха сеў,
Ажно Лыска прыляцеў,—
Як на панскай службе стаў,
Па прыязні ён мне кажа:
"Кінь ты, куме, жытло ўражжа:
Цяпер марна прападаеш,
А ты ж гэткі спосаб знаеш:
Майму пану стань служыць,
Табе добра будзе быць".
"А ты дурню, думаў я:
Мне вярнуцца да сяла?
З сваім панам і сялом
Задушыся ты калом,
Хоць галодзен — я свабодзен,
Гдзе мне цягне — там бягу,—
На свабодзе прападу,
А ў няволю — не пайду!
Буду вольным ваўкалакам,
Ты ж — на прывязі сабакам!"

СТАРШЫНА

Альгерд Абуховіч

Хоць які парадак дай,
Адно тое, братка, знай,
Што крутнёю ўсёй накруціш
І найлепшэ збаламуціш.
Льва-манарха Воўк прасіў,—
Каб вайтом яго зрабіў,
Бо Авечкі скрозь ў бязладдзі,
Вельмі шкодзяць ў панскім садзе,
Ды і самі прападаюць;
Бо, як жыць, яны не знаюць.
І Ліса за ім прасіла
(Яе жонка Льва любіла),
Воўк з Лісіцаю звязаўся
І як можна так стараўся:
Дзе прасілі, дзе ўздыхнулі,
Дзе гасцінца падаткнулі,
Каб дабіцца да медалі.
І плацілі, і прасілі, і стагналі...
Леў прамовіў: “Ходзяць толкі,
Што Авец з’ядаюць Воўкі”.
І сазваць сказаў народ
На звярыны вольны сход,
Паспытаць усіх звярат:
“Воўк ці добры, ці ён гад?”
Чыны важны ўсе прыйшлі,
Ўсё начальства тут было,
Ды прычыны не знайшлі,
Зла аб Воўку не чутно:
Пад судом ён, бач, не быў
І з начальствам добра жыў,
Дык медаль пан войт надзеў
На авечы цэлы хлеў.
А Авечкі што сказалі? —
Іх на сход зусім не звалі,
А ўпісана ў пратаколе,
Што “Авечкам дана воля”.

Рукопись басни «Ваўкалак». Фото из книги «Альгерд Абуховіч. Творы» (Мінск, 1991).

СУД

Альгерд Абуховіч

Там, дзе пушча, за прасёлкам,
Калісь ліс жыў з шэрым воўкам
І, як весць людская кажа,
Жыло згодна племя ўража;
Ды да часу.
Хутка сварка там пайшла:
Ўкрыўдзіў нечым ліс ваўка.
Дайшло дзела да суда.
Можа, праўда, можа, не,—
Адвакаты — два сабакі на судзе.
Кожны брэша, на праціўніка вядзе.
А суддзёю быў глушэц,
Ён разумны ці глупец,
Тое трудна разгадаць,
Адно толькі, як чуваць,
Што рашыў ён дзела так:
Выгнаць з суду ўсіх сабак,
А воўк з лісам плоцяць штраф.
Воўк — бо хлусіць ён напрасна,
Ліс — бо злодзей.
Гэта ясна:
Круцялёў чым разбіраць,
Лепш абодвух пакараць.

ВОЎК І ЛІСІЦА

Альгерд Абуховіч

«На табе, нябожа,
Што мне нязгожа».
Раз папалася лісіцы
Ажно тры злавіць курыцы.
Падушыла; дзве з іх з'ела,
Трэццю скрыла.
Сама села —
Як па працы — пад стажком
Воўк галодны йшоў нішком.
А што з кумою быў знаём,

То такую рэч павёў:
— Ах, сястрыца,— кажа кум,—
Я ад рання браў на вум,
Каб што-кольвек мне пад'есці,
А тут на злосць негдзе ўлезці.
Падхапіў бы я хоць птушку...
Да авец падходзіў збочку,
Ды пастух чупрыну чэша,
І сабака прытым брэша,—
Падступіцца няма складу!..
Дай ты, кумка, яку раду?!
— Ох, мой куме даражэнькі!
То ж стог сена цалюсенькі.
Еж, як хочаш,— не шкадую,
Хоць апошнім, ды частую!
— Дзякуй, дзякуй! — сказаў шэры
І пацягся без вячэры.

ДУМА А КАРАЛЮ XII

Альгерд Абуховіч

Зоры паўночы кроўю пылаюць,
Снежны чырвонюць прасторы;
Людзям варожбы ліхі звяшчаюць
Зораў паўночных разоры.
Ось тры малойцы,— з асобна кожны,
Буйныя думы гналі з укрыцця;
На поўнач кідалі ўзгляды трывожны
З мыслю, што стрэнуць у жыцці.
Той каралеўскай жадаў кароны,—
Не дбаў аб чэсць у патомных,
Каб толькі д'ядэм мецi злачоны
На скронях сваіх нікчомных.
Гэты, дзе поўнач, зроджэн на цара,
Імператорам меў стацца,
Хоць баранілі народ і вера
Айчызне з грунту зменяцца.
Дала абодвым злая фартуна
Сваіх дасціці намераў:
Першы на Польшчу кінуў цалуны,
А той расшырыў моц потараў.
Трэці, на стромкай апёршысь скалі,
Дзе вілі гнёзды саколы,
Думаў прайначыць злой долі шалі,
Не дбаў аб цяжкі мазолі.
Зоры шырока неба крывавюць,
Крывавюць землі і воды,—
Гэтак шырока твае расславяць,
Манаршэ, імя народы.
К шчасцю народаў, дзля іхнай славы
Агністо біло ў ім сэрцэ...
Будзьце ж пракляты, палі Палтавы,
І ты, народаў мардэрца!
Памерклі зоры, памеркла слава,
Русь у няволі марнее;
З гробу Кароля, з поля Палтавы
Устаньце, народаў надзеі!



Могила Альгерда Абуховича на кладбище в Слуцке.
Фото «Радыё Свабода» 24.08.2009 http://www.svaboda.org

З ПАПЕРАЎ АЛЬГЕРДА АБУХОВІЧА

I. УСПАМІНЫ КІЕВА

Радзіўся я, 25 ліпеня (дзень св. Якуба) 1840 года. Прынялі мяне з жалем і абразай: быў я калекі. Думалі, што або зара памру, як брат майго бацькі, каторы меў гэтае самае калецтва, або буду ідыётам, як Генрык Быкоўскі з Русаковіч, таксама трывусны. Тым часам я гадаваўся, і пастанавілі аддаць мяне ў гімназію ў Слуцак. Але і мне самому не хацелася і бацькам маім таксама не хацелася аддаваць калекага хлопца на кпінкі і здзекі равеснікаў; трэба было зрабіць спярша аперацыю, каторай тагачасныя дактары на Беларусі неяк баяліся. Слылі тады як аператары: Пірагоў, Кажанеўскі і Караваеў. Гэты апошні быў прафесарам Кіеўскага універсітэта, а да Кіева было і найбліжэй і найлягчэй дабрацца. Пачалі выбірацца ў Кіеў да Караваева, а ў гэтым часе разышлася чутка, што царыца, жонка Мікалая I, занядужыла на вочы, што маюць рабіць ёй аперацыю і што Караваева на вясну паклікалі ў Пецярбург. Дык едзем перад вясною, але ўжо коламі, па чарнігаўскіх растопах. Дарога ішла на Лоеў і Чарнігаў. Запрагалі ў адну карэту шэсцера каней, а пад фарысія (1) — трое або чацвера, у каламажку, што ішла ззаду з нашай службай, запрэжана было пяцёра каней. Мы нідзе не загразлі, але бачылі карэты, цягнутыя некалькімі парамі валоў, і то на паштовым тракце (шосы яшчэ не было). На Дзесні, пад Чарнігавам разлітай на 10 вёрст, сарвалася бура, і паром наш занесла на нейкі бязлюдны груд (2), дзе і прыйшлося нам начаваць. У Бравapox уз'ехалі мы на шосу і пасля сталі над разлітым Дняпром. Мост тады яшчэ будаваўся: перабіраліся паромам.

Нестае ў мяне агня, каб апісаць мае тагочасныя дзіцячыя ўражанні, калі я ўбачыў Кіеў, а памятаю ўсё: і нейкага ваеннага старца, які раіў матцы маей,— думаючы, што яна сама едзе лячыцца,— не звяртацца

да дактароў, але піць ваду з Днепра, бо святая; і аднаго з нашых фурманоў, вельмі харошага маладога русавалосага хлопца, каторы выказываў мне спачуццё, што мяне будуць «рэзаць»,— сягоння бы паказаў яго, каб ён быў гэткі малады і гожы, як перад 40 з гарой гадамі (было гэта ў 1852 г.). У канцы канцоў прыехалі на Ліпкі, там, дзе сягоння палац, а тады былі нейкія быццам «мінеральныя воды» і гасцініца. Доўга прагладалі нашы пашпарты, перш чым упусцілі нас у некалькі саўсім не элеганцкіх святлічак.

Назаўтра паехаў я з маім вучыцелем, п. Прыборам, да Караваева, каторы прыняў нас у універсітэце (затым прызнаеце мне, што я быў у Кіеўскім універсітэце!). Караваеў агледзіў мяне і аперацыю назначыў на другі дзень, у панядзелак. А панядзелак гэты прыпадаў у вялікім тыдні, 13 красавіка. Панядзелак і трынаццатае! Караваеў сказаў матцы, што хларафармаваць не будзе, «а хлопчык будзе крычаць». Я сказаў, што крычаць не буду. Здаецца, што Караваеў узяў за аперацыю 150 руб., Цэцурын — 50, а Кучэўскі — 25,— здаецца, што не болей. Надышоў панядзелак. А 10 гадзіне раніцай прыехаў Караваеў з Цэцурыным і студэнтам-медыкам п. Кучэўскім. Вынялі інструменты і зажадалі лаёвай свечкі, каб пацягнуць аб яе нажы. Я пачуў такое дакучлівае дрыжанне на ўсім целе, што выбег адліць ваду. Гэтага адразу ніхто не ўгледзіў, але скора агледзеліся, што мяне няма, і думалі, што я ўцёк, так што я, вяртаючыся, сустрэціў усіх аператараў, каторыя хацелі выходзіць. Вярнуў іх, сеў у крэсле з поручамі; мяне абвязалі сурвэткай, як да снедання. Аперацыя цягнулася 8 мінут. Ніхто мяне не трымаў, я сам рукі прыціскаў да поручаў крэсла. Мая матка сядзела ў суседнім пакоі і казала, што чула незвычайны шум у вушах і толькі пад канец пачула, як некалькі разоў нешта прыкра скрыгнула: мабыць, было гэта абрэзанне шпілек, удзетых у вусны. Як скончылася аперацыя, пачалі мяне хваліць за маю цярплівасць. Караваеў расказваў аб гэтым у клініцы. Прайшло пара дзён, і раптам уначы палілася з артэрыі кроў, падняўся перапалох. Мой вучыцель, п. Прыбора, павіпен быў ісці да доктара, але гэта даслоўна ісці, бо калі не памыляюся, то ў Кіеве было тады ўсяго панства — тры рамізу, а ў тых, што хадзілі ноччу, пыталіся пашпартоў, і хто не меў прыпадкам пры сабе пашпарту, садзілі ў халодную. Аб ліхтарнях на вуліцах яшчэ там ніхто не чуваў. Кроў лілася, а Прыбору не пускалі да Караваева, каторы жыў блізка каля універсітэту, здаецца, ў старане батанічнага саду. Па чатырох гадзінах кроў заматавалі. У два дні пазней, дужа рана, ізноў бухнула кроў; гэтым разам п. Прыбора знайшоў рэмізу, але Караваеў «уехал говеть». У каторую цэркву? — «Не могу знать». Аднак жа хутчэй, чым першы раз, прыбыла помач.

У Кіеве пазнаў я сваіх стрыечных дзвёх сясцёр, незвычайна гожых, падрастаючых ужо дзяўчынак, ды брата Ярослава, крыху старшага за мяне, і маленькага Багдана. Дзядзькі мае жылі ў Кіеве дзеля выхавання дзяцей; ім зайздросцілі, што маюць лёгкую дарогу ў Кіеў: калі пераваз іліся туды, то дзядзька мой загадаў пабудаваць байдак (3), на каторы паставілі 4 каней, гэтулькі сама кароў і ў прапорцыі рознай іншай гаспадаркі, з патрэбнай мерай корму, а ў каюты памясцілі паноў і слуг, ну і паплылі, як у каўчэзе Ноя (гэта тады называлася, што падарожжа нічога не каштуе!). Дом у Кіеве яны мелі свой, дужа блізка ад універсітэту, здаецца, што на Володзімерскай вуліцы. Праходзіць трэба было міма самаго універсітэту і ісці далей; было пара дамоў мураваных, пасля вялікі драўляны дом Оскеркаў, а побач гэткі ж, толькі крыху менш, дом майго дзядзькі з вялікім пустым пляцам, каторы злучаўся ужо з полем. Поле не было засеяна і выглядала, як нейкі гарадскі выган. Цешыліся, што жывуць быццам у вёсцы, а было гэта ад універсітэту, як ад камітэту да Бернадынскага касцёлу ў нашым Слуцку, не далей. У гасцініцы «Мінеральных вод» менш было шыку, чым цяпер у Лейбіхі ў Слуцку, толькі гасцініца прытыкала да царскага саду, у каторым дзіўныя алеі вялі на бераг Днепра. Відокі там так дзіўныя, што хоць пасля я бачыў свету, адначэ відокі Кіева і яго хараство назаўсёды асталіся ў мяне ў памяці. Першы раз бачыў я там тэатр. Быў ён на Падолі мураваны, брудны, цесны і цёмны. Ігралі дзве нейкія штукі: польскую і расійскую, здаецца, што ў абодвых было мардабойства, і памятаю, што ў расійскай былі нейкія брыдкія словы. Рух на Крашчацiку, колькі памятаю, не быў больш, як у Слуцку на Мастовай4 вуліцы ў targowy дзень. У царскім садзе публікі збіралася многа, пагода служыла, ды і вясна там пачынаецца раней, як у нас. Усе ведалі аба мне і звярталі ўвагу. Я быў героем дня, што дужа патурала маёй амбіцыі. Хоць у тэатры ігралі штукі па-польску, але на вуліцах мовы польскай, даслоўна, не чуў, і ў гэтым, як і ў многа чым іншым, знайшоў я вялікую перамену, будучы ў Кіеве ў 1878 годзе...

II. ПАЛАЖЭННЕ СЯЛЯН

Святой сваёй павіннасцю лічу апісаць палажэпне сялян, каторае ў першым раздзеле зачапіў нават неспадзявана для сябе.

Пасля таго як мы вярнуліся з Кіева, да канца лета былі мы яшчэ дома, гэта значыць у Калатычах. Перад пачаткам школьнага году пераехала мая матка разам са мной у Слуцак на пастаяннае жыццё, а бацька паехаў у ўлюблёнае сваё Грабова* [*Грабовы ёсць два ў Мозырскім павеце: «Вялікае» — калісь Абуховічаў і «Малое» — калісь Радзівілаў. Водка — старка, каторую прадаюць Карказовічы, паходзіць з Радзівілаўскага Грабова. (Прыпіс аўтара.)*] ў Мозырскі павет. Стасункі з воласцю былі ўжо напярэдадні волі лепшыя; лагоднымі іх назваць няможна (за цара Мікалая лагоднасці не было), а толькі былі быццам патрыярхальныя. У Грабове было некалькі сялян-гаспадароў, людзей шанаваных і справядлівых, каторыя былі ў зажыласці з самім панам (6),— то гэтым стрымлівалася крыху страшэнная самаволя намеснікаў. У Калатычах жа астаўся неаграніченым уладаром Кароль Булгак, казалі, банкарт (7) «слаўнага» (?) Булгарына, з мясцовых сялян, чалавек малады, але злога характару,— і бяздольнікі завылі.

Пад канец зімы з'яўляюцца пасланцы ад калатыцкіх сялян, молючы ў маткі маей ратунку. Першай прыбыла маладая, гожая дзяўчына, Куліна, каторую розгамі прымушалі

да любові; ёй пазволілі астацца ў Слуцку і зара найшлі службу, а другія дасталі на рукі нешта кшталтам «жалезных лістоў», каб ніхто не смеў і пальцам крануць аж да прыезду пані. Апрача гэтага, нарочны пасланец завёз ліст да майго бацькі, у каторым паведамлялася, што на Вялікдзень прыедзем у Калатычы.

Тут скажу, што я першы раз бачыў уплыў духу надыходзячай волі: заместа адпору са стараны бацькі наступіла яго поўная згода парабіць уступкі сялянам. Запрасілі на нараду мясцовага пароха (8), уніяцкага ксяндза Андрэеўскага, улажылі нешта кшталтам канстытуцыі, і з гэтага часу быт нашых падданых на вачах пачаў папраўляцца. Бог даў падрад некалькі ўраджайных гадоў, так што даходы ўтрое павялічыліся, новую прыкупілі вёску (Заполле), і тысяча «душ» людзей мелі працаваць на хлеб для маладога Ольдзі, каторы сягоння, пішучы гэтыя ўспаміны, павінен прызнацца, што не мае ані «буднага хлеба», ані страхі над галавой, ані нічога, апрача колькіх сваіх прыяцелёў: talis est mutatiuo retum (9)!

Услед пасля гэтага бацька мой пробаваў ачыншаваць (10) сваю вёску Бубноўку (сягоння ўласнасць Фелькі Чарноцкага); хаця гэта спярша не аказалася практычным, бо было перадчасным, але сягонняшнія ўспаміны Бубноўскай чыняць славу памяці даўнейшага іхнага пана.

Растучы, я развіваўся, а перада мною што-раз харашэй рассцілаўся свет: на царскім троне сеў, слаўнай памяці, Аляксандр II, насталі часы, аб каторых можна сказаць, што людзей нікчэмных яны не бачылі. Не стала бы паветра для подлых інстынктаў. Няхай цяперашняе пакаленне зайздросціць, што я на гэта глядзеў сваімі вачамі. Чэсць тагачаснай кіеўскай маладзёжы, каторая была дэмакратычнай і «хлопаманскай».

IV. МОЙ ДЗЕД

Дзед мой бачыў Робесп'ера15
Адвакатам і акторам,
Ды не думаў, што кар'ера
Яго зробіць дыктаторам.

Дзед мой Юзеф Абуховіч граф Бандзінелі, мабыць, ніколі не бачыў Рабесп'ера; калі быў у Парыжы і Версалі як шамбеляна (16) польскага двара, то гэта будучая знамянітасць сядзела недзе яшчэ ў Аррас. Калі ж закіпела рэвалюцыя і Робесп'ер выплыў наверх, то дзед мой быў на іншым становішчы: спярша быў жаўнерам пад Касцюшкам (17), а пасля, як баніта (18), выняты з-пад права, пад прыдуманым прозвішчам тры гады быў фурманам у ваяводзіхі Хадкевічыхі на Падолі: «talis est mutatiorerum». Мабыць, з тых часоў ці, можа, і раней завязаліся нейкія асаблівыя стасункі з Пулавамі і сям'ёй князёў Чартарыйскіх. Дзед-нябожчык аб сваёй мінуўшчыне ніколі нам не расказваў — тое, што мы ведалі аб ім, то толькі недзе са стараны,— але ведаю, што ён старасвецкія сямейныя памятнікі адаслаў у Пулавы, з Пулаў атрымліваў і розныя весткі. Калі я ў 1860 гаду быў прадстаўлены кн. Адаму Чартарыйскаму, то ён, 90-летні старац, пачуўшы маю фамілію, быццам ажывіўся і спытаў: «Сын шамбеляна?» — «Унук, міласцівы князю».— «Так, Юзеф Абуховіч, мусі, даўно ўжо не жыве, ён старэйшы быў за мяне»,— і з гэтымі словамі быццам ізноў асунуўся. Каб гэта і не быў князь Адам, то ўсё ж такі з такім паважным старым чалавекам нельга было адважыцца нахрапам распытывацца аб падробніцах з мінуўшага; дык захаваў я сваю цікавасць да якой-колечы шчаслівейшай зручнасці, каторая ўжо не надарылася, хаця пасля не раз, нават часта, бачыў я старога князя. Калінка мне казаў, што, яшчэ мяне не знаючы, чуў разгаварываючага князя Адама з сваёй сястрой княгіняй Віртэмберскай (аўтаркай «Pielgrzymek z Dobromila» (19), як маю фамілію яны ўспаміналі ў нейкай вясёлай гутарцы, але аб што ішло — не памятаў, а калі я быў у Парыжы — княгіня ўжо не жыла. Можа, нейкія дагэтуль нязнаныя памятнікі кінуць святло з таго кавалка жыцця і паступкаў майго дзеда.

VI. «ГРАФ БАНДЗІНЕЛІ»

Я падпісваюся па маіх беларускіх творах «Граф Бандзінелі»: гэта прозвішча маей бабкі, апошняй з гэтага роду, каторы выдаў такую знамянітасць, як папеж Аляксандр III. Бачыў я на plet fond (21) у залі «Трохсот» у палацы дожаў (22) сцэну: цэсар прымушан пасці ў ногі папежу. Папеж стаўляе адну нагу на сагнутым карку цэсара і кажа: «Super aspidem et basiliscum ambulabo et conculcabo draconem et bovem» (23). Расшалелы ў сваім паніжэнні дэспат кажа: «Пакараюся Пятру, а не табе». А тады Аляксандр III граф Бандзінелі, становіцца абодвымі нагамі на яго імператарскай спіне і зычным кажа голасам: «Et Petri et mihi» (24). З роду Бандзінеліх быў слаўны тварэц «Laokoona». У італьянскай бацькаўшчыне слыў гэты магнацкі род і прыбыў у Польшчу як амбасадар (25) Неапалітанскі, за Яна III (26). Гэты амбасадар неапалітанскі, уміраючы ў Варшаве, пакінуў сына, майго прашчура. Аляксандр граф Бандзінелі, падкаморы Дэрптскі, дзядзька маей бабкі, бачучы род свой угасаючым, усынавіў род Абуховічаў.

Пазываючыся ў подпісы на дзядоў сваіх, грудзі мае парушае пачуццё нечага вялікага, сільнага... Чытаючы ж Пушкіна, мяне дзівіць пазыванне на яго афрыканскае паходжанне. Куплены за бутэльку рому «Арап Пятра Вялікага» — гэта пратопляста Пушкіна. «Нечага хваліцца» — скажа кожны. Але іначай разумее гэта псіхалогія маскоўская: «Памілуйце, Царскі Дзяншчык!..» Гэта быццам нешта сярэдняе між чалавекам і анёлам святым!

Не Сібір, астрог, не кнут —
І не цела цяжкі мукі,
Але дух народу струт...

X. ЛІТАРАТУРНАЕ АПРАЎДАННЕ

Праглядаючы мае вершы, Францішак Багушэвіч зрабіў увагу, што ў мяне не ўсюды бываюць уласцівыя беларускай мове акцэнты. На гэта я яму адпісаў:

У гаворцы ёсць ружніца
Між маею і Тваей:
Маей — пушчы, Птыч (32) граніца,
Ты— Панарскі салавей!..

Гэта значыць: у Беларусі ёсць

многа асобных дыялектаў-гутарак, і ў гаворцы між Магілева над Днеправым Мозырам і Гродняй бывае вялікая розніца не толькі ў акцэнтах, але ёсць і многа цікавых правінцыяналізмаў. От, напрыклад, некалькі нашых палеска-беларускіх правінцыяналізмаў,— ручаюся, што іх у віленска-гродзенскай беларускай мове або саўсім не ўжываюць, або ўжываюць рэдка. «Нашчадзь» — патомства, будучае пакаленне; «нішком» — ціхачом, пакрыёму, хаваючыся; «плён» — расток, малады белы карэньчык пры зярне і шмат іншых.

Мне перш за ўсё ідзе аб тое, каб выказаць, што я хачу, каб пачулі мысль маю і каб словы карэнныя беларускія пры помачы нашай літаратуры атрымалі як найшырэйшае абывацельства. І дзеля гэтага я не сцясняю свайго дыялекту, ужываючы словы і звароты агульнабеларускія. Гэтак паступаючы, я кладу ў літаратуру свой прыродны дыялект беларускай мовы, даючы найлепшае з яго. У канцы невядомай яшчэ, каторы дыялект беларускі пераможа. У Францыі — спярша дыялект правінцыі Lanque d'Oc меў перавагу ў французскай літаратуры, а пазней Lanque d'Oui — цяперашняя французчына. Гэта трэба памятаць і нашым літаратарам і пурытанізмам не забаўляцца!

XI. СПАС 20/VII 1904

«Прыйшоў Пятрок — апаў лісток; прыйшоў Ілля — апала два; прыйшоў Спас — усяму час».

Сягонняшні дзень умацаваўся ў маёй памяці: першы раз пачуў я, як да мяне сказана: «Дзеду, дзедку!» Было гэткае здарэнне: пад вечар зайшоў я да майго даўнага суседа, п. Сымона Легатовіча, і трапіў там на дажынкі. П. Сымон, маючы добрую грамаду работнікаў да аплаты і пачастунку, саваў каждаму ў рукі квіток на заробленыя грошы і, нічога не кажучы, ішоў далей. Пісьменнага ў гэтай грамадзе нікога не было, а я апынуўся між сялянамі, дык пачалі спярша па аднаму, пасля грамадой звяртацца да мяне: «Дзеду, дзедку,— прачытайце!» Ста-расць міла з гэтым павітаннем мне ўсміхнулася; збудзіўся добры гумар... Пайшоў шукаць я гожую паненку Маню Легатовічанку, каб «дзеўкі краснай ручкі белы» ўрачылі мой свежа атрыманы патэнт на старэчую павагу «Дзеда». Sclavus saltans (33), а аднак неяк міла,— чую ў сабе славяніна. Народ рабочы заўзята танцаваў у слаўнай залі Зарэцкага палацу, брала ахвота і мне патанцаваць, але ўражанні былі іншага зместу.

Зарэчча памятаю з тых часоў, калі я быў такі маленькі, што прысмакі мне на крэсле, а не на стале стаўлялі. Пасля не быў там лет колькі-наццаць... Зарэчча — гэта толькі частка Глускага графства; атрымаў яго п. Кароль Нерэзыуш за дакананне вельмі цікавай справы, так званай эксдывізіі Глускай. Але, дзеля ўдзячнасці і пашаны да п. Кароля, раскажу аб ім асобна.

Герб Нерэзыушоў — гэта крыж і месяц маладзік — здаецца Czorуja. Апошняя з гэтага дому Станіслава Легатовіч пыталася ў мяне, ці не ведаю чаго аб яе родзе. От жа: паводле апавядання самога Кароля Нерэзыуша, быў ён рэгентам пры Навагрудскім судзе, пасля нейкі час працаваў у натарыуса і ўзяў пасля смерці дзеда майго, Юзефа Абуховіча, справы і маетнасць. Дзед мой сардэчна яго палюбіў, а св. памяці бабка мая цярпець яго не магла. Было гэта каля 1825 года, часы былі добрыя, і п.Кароль, «Нарулёнкам» празываны ад дзеда майго, добра ўладзіўшы свае маёнткавыя справы, хацеў выкупіць ад маршалка Філіпа Абуховіча Капцэвічы, адвечную Абуховічаўскую маетнасць, каб толькі дзед мой гэту маетнасць ад яго прыняў і прыпаручыў яму справу належачага нам Стальянскага спадку (34) па Бандзінеліх і зацверджанне графскага тытулу. Тут нахлынулі важнейшыя здарэнні: выбухла паўстанне. На Беларусі азбраіваліся і ла дварох муштраваліся (муштры адбываліся ў Маложаве, гэтая мясцовасць у хронікароў называецца Акунёўкай,— там Вітаўт (35) пабіў татараў, цяпер Акунёўка — ручаёк, аддзяляючы ўрочышча Маложэва ад вёскі Акунёўкі). Нехта непатрэбны падглядзіў гэтыя прыгатаўленні і даў данос. Падазравалі ў даносе чыноўніка п. Міткевіча і генерала Гатоўскага, але гэты апошні быў чалавек шанаваны, хоць маскаль, і адкрыта агрызаўся з дзедам маім. Міткевіч такжа меў добрую славу, дык, мабыць, нехта трэці паспяшаўся асцерагчы ўласці. Пасля гэтага даносу прыказана было капітану Бехамо арыштаваць майго дзеда, што прыйшлося рабіць аружнай рукой, бо люднасць сялянская стала адпорна, за-барыкадавалася ў дварэ, з прыроды даволі недаступным, і пачалася страляніна. Забітых не было, але з абодвух старон некалькі душ ранена. П. Кароль скланіў тады дзеда да капітуляцыі, бо ўтрымацца доўга нельга было, а з главнага плацу падышлі непамысныя весткі. Забралі тады старычка падкаморчыца, і хоць жыў яшчэ гады чатыры, але свабоды ўжо не бачыў.

Роля парламентара не прайшла п. Каролю насуха: казак, не пазнаўшыся на яго тагды святым і недатыкальным характары, сперазаў яго чатыры разы нагайкай, за што казака высеклі, а п. Каролю так з'яднала гэта маскоўскую старшызну, што яго прызналі адміністратарам ад правіцельства над маетнасцямі майго дзеда. З апякунства п. Нерэзыуш вывязаўся як найсумленней. Дзед мой вызнае гэта ў тэстаменце (36) і запісвае свайму «Нарулёнку» тысячу дукатаў.

У гэтым часе сталася нейкая таемная справа, аб пачатках каторай магу толькі дадумвацца і дзеля гэтага буду гаварыць толькі аб скутках (37) яе.

Быў нейкі чалавек, бацька мой з нейкай трывогай называў яго «Пёровіч», а Нерэзыуш — «Пёрка, каторага я здаў у рэкруты», але гэнае пёрка, відаць, было ўстрэмлена ў нейкае балючае месца, бо п. Кароль не будаваў свайго палацу ў Зарэччы датуль, пакуль не даведаўся, што Пёркі ўжо няма на свеце. Сяляне яго вельмі ждалі, нейкія надзеі загараліся ў іх пры ўспамінах аб ім, але ўсё гэта пакрыта было таемнасцю. Пёровіч, уцёкшы з салдатаў, укрываўся; — начамі ён часам прыходзіў да майго бацькі, што заз-вычай было прычынай вялікага перапалоху. Казаў заўсёды, што памсціцца на панох. Каля Солетнік часцей паяўляўся і там ён загінуў. Расказваюць: утапілі яго па загаду майго дзядзькі. Быў гэта, мабыць, чалавек незвычайны, калі, будучы банітам, вынятым з-пад права, праз 20 гадоў трымаў у гразе амаль цэлы павет. І хоць паходзіў з сялян, але быў чалавекам вельмі адукаваным, уроды гожай, мілы і красамоўны. Захаванне між сялянамі меў незвычайнае. Насіўся з нейкімі рэфарматарскімі планамі і для сваёй справы еднаў прыхільнікаў між сялянамі толькі. Па смерці Пёровіча яго рэфарматарскімі планамі зацікавілася жандармерыя, было следства. Сяляне адчапіліся нічога не веданнем, шляхта не рада ішла па гутаркі аб сваім ворагу. Следства скончылася зданнем ў салдаты двох нічым нявінных сялян. Расказвалі сяляне ў вялікай тайніцы аб нейкіх «граматах», недзе пераховываных у вучнёў Пёровіча. За год 10—15 справа гэта саўсім заглохла.

Па дойсцю да поўналетнасці бацькі майго п. Нерэзыуш злажыў з сябе павіннасць апекуна над Абуховічаўскімі маетнасцямі і прыняў інтарэсы маршалка Рудзееўскага (гэтага роду не трэба мяшаць з Радзееўскімі). П. Кароль ажаніўся з Ідаліей Юдыцкай, апошняй дзедзічкай (38) Глуска. Ключ Глускі быў Юдыцкімі вельмі абдоўжан і перайшоў ужо некалькі эксдывізій, але п. Кароль дагледзіў, што першая з гэтых эксдывізій, на каторай апіраліся ўсе пазнейшыя, мела нейкія нефармальнасці і не была зацверджана. Ён падняў гэтае пытанне і даў довад да ўтварэння эксдывізіі пап-

раўчай Глускай. Учасце ў ёй прынялі людзі вельмі часамі падозрэнай славы, як Юзеф Свіда, Ігнат Тукало (цётачна-Зродны брат маей бабкі Альжбеты з Венцлавовічаў Естковай. Естко — экслегіяніст, каторы здабыў на вайне разам з лаўрамі Напалеонскімі грамадную суму наполеондараў) — і іншыя, а найгоршым быў маршалак Бжозоўскі, банкарт аднаго з Юдыцкіх, каторы адпрысягнуў праўнасць скрыптаў (39) натуральнага свайго бацькі, выданых ахмістрыні Бжозоўскай, гэта значыць, сваёй матцы, аб каторых агульнавядома, што былі фікцыйныя. Гэты Бжозоўскі быў бацькам знанага за нашых часоў Міхаіла Бжозоўскага (рожд. са Здзехоўскай), каторы слыў з бясчэльнасці і досціпу. Хацеў яго адзін раз дакарыць п. Юзеф Свіда і, папярэдзіўшы аб гэтым чысленую кампанію, кажа да ўхадзячага Бжозоўскага: «Як маешся, пане Юдыцкі?» — «Здароў, гадуюся, пане Ванковіч!» — адказаў Бжозоўскі. Мне здаецца, што лепей зрэзаць не можна! Прыпамінае мне гэта анекдотку, чутую ў Францыі: кароль Генрых IV сустрэў нейкага шляхціца, саўсім да сябе падобнага, дык, стукаючы яго па плячу, пытаецца: «Скажы, васпан, ці твая матка была пры дварэ майго бацькі?» Шляхціц адказвае: «Не, найяснейшы каралю, мой бацька быў лёкаем пры яе міласці каралеве, матцы вашай міласці».

Але, вяртаючыся да Нерэзыуша і эксдывізіі, скажу, што п. Кароль з гэнай мутнай вады ёмкую рыбу вылавіў: суд абмінуў крэдытароў Юдыцкіх, Фастовічы выдзеліў Бжозоўскаму, а Зарэчча асталося для п. Рудзееўскай і перайшло да Нерэзыуша невядомым нейкім парадкам,— кажу невядомым, бо памятаю гэткую справу.

Зімою 1847 года адбывалася вельмі пышнае вяселле панны Анелі Естко, дачкі Якуба. Была гэта багатая едыначка, свецка адукаваная, саўсім прыстойная. Я спадзяваўся для яе бліскучай партыі, тым часам яна выйшла за Оттона Ёдку; чалавек ён быў не быстры, але добры. Пан Якуб Естко быў гэта чалавек багаты, паважаны і з шырокімі стасункамі, меў нейкі вышэйшы ўрад ад выбараў і быў пры гэтым адным з глаўных мецэнатаў Едноты Кальвінскай; меў сваякоў, прыяцелеў і знаёмых даволі, дык і паклікаў усіх на вяселле сваёй едыначкі. Сярод марозаў і бур вельмі вострай зімы 47-га года тры, нават чатыры губерні Беларускія рушылі на вяселле ў Турына, у Ігуменскі павет. Біскуп номінат мінскі кс. Рава прыехаў даваць шлюб. Між іншым быў гэта адзін з найбольш аграніčаных ксяндзоў у Мінскай дыцэзіі (40). Цар Мікалай хацеў яго канечна зрабіць біскупам і тры разы прадстаўляў Сталіцы Апостальскай, але дармо. На шлюбе кс. Рава меў мову, пачынаючуюся ад слоў: «Рука руку мые, а якая ж міласць ёсць між рукамі? Нага нагу падпірае, а якая ж міласць паміж нагамі?» і г. д.

Дык вяселле Турынскае было вельмі гучнае. Паўтараста асоб з розных старон сабралася, і цэлы тыдзень банкетавалі, да нядаўна яшчэ можна было чуць розныя аб ім успаміны. Само сабой, калі далей буду спісываць свае ўспаміны, то яшчэ калісь нешта аб гэтым вяселлі напішу, бо мела яно шмат чаго цікавага з абычаёў вясельных даўных, што цяпер ужо пазабыты. На вяселлі былі і бацькі мае. Была такжа і грабіна (41) Юдыцкая з дачкой сваёй, паняй Рудзееўскай. Так мая матка, як і пані Юдыцкая, былі Есткоўны з дому і сустрэліся ў Турыне па доўгім часе разлукі з сабой. Вяртаючыся з вяселля, заехаліся яны ў Калатычы і тут найнеспадзяванне для сябе даведаліся, што Зарэчча не іх уласнасць, а што яно належыць да Нерэзыуша.

Каментарыі

1 Фарысія — памочнік кучара.

2 Груд — тут у сэнсе ўзгорак або невялікі астравок.

3 Байдак — барка.

4 Цяпер вуліца імя У. І. Леніна.

5 Пушчык — Пушчын Міхаіл Іванавіч (1800—1869) — капітан лейб-гвардыі, удзельнік паўстання дзекабрыстаў.

6 Былі ў зажыласці з самім панам — г. зн. жылі з панам у добрых адносінах.

7 Банкарт — незаконнанароджаны.

8 Парох (польск.) — духоўны кіраўнік парафіі, г. зн. царкоўнага прыхода.

9 Talis est mutatiuo retum (лац.) — так змяняюцца рэчы.

10 Ачыншаваць вёску — з баршчыны перавесці на чынш (узнос, які плацяць уладальніку зямлі ў тым выпадку, калі зямля перадаецца арандатару ў бестэрміновае снадчыннае валоданне).

15 Робесп'ер — Рабесп'ер Максімільен Мары Ізідор (1758—1794) — дзеяч Вялікай французскай рэвалюцыі канца XVIII ст.

16 Шамбелян — камергер.

17 Касцюшка, Тадэвуш (1746—1817) — кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, на Беларусі і Літве.

18 Баніта — выгнаннік.

19 Pielgrzytek z Dobromila (польск.) — Пілігрым з Доброміля.

22 Дожы (гіст.) — галоўныя кіраўнікі рэспублікі ў сярэдневяковай Венецыі і Генуі.

23 Super aspidem et basiliscum ambulabo et conculcabo draconem et bovem (лац.) — наступлю на аспіда і базіліска і патапчу дракона і быка.

24 Et Petri et mihi (лац.) — і Пятру і мне.

25 Амбасадар (польск.) — пасол.

26 Ян III (Сабескі) — польскі кароль.

32 Птыч — Пціч, левы лрыток Прыпяці.

33 Sclavus saltans (лац.) — нявольнік, які танцуе.

34 Спадак — спадчына.

35 Вітаўт (1350—1430) — вялікі князь літоўскі з 1392 г.

36 Тэстамент — завяшчанне.

37 Аб скутках—аб выніках.

38 Дзедзічка — наследніца маёнтка.

39 Скрыпты (лац.) — дакументы.

40 Дыцэзія (польск.) — дысцэзія, біскупства.

41 Грабіна (польск.) — графіня.

№ 7-8 (87-88) Июль 02010 г.

Глуская ПАНОРАМА

Выходит с июля 1998 г.

Издатель - Игорь Кирин. Подписано к печати 30.07.2010.
Отпечатано на собственном оборудовании.
Тираж - 150 экз. Распространяется бесплатно.
Адрес для писем: 213879, г.п. Глуск, ул. Кирова, 43-18.
Тел. 41522. E-mail: glu-cl@mail.ru
http://www.gluskonline.net